ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
27 ВЕРАСНЯ
ЧАЦВЕР
№ 24 (1437)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

## ПАЧАЛІСЯ ЗАНЯТКІ

на аддзяленнях палітэканоміі, рускай мовы і літаратуры і гісторыі факультэта павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Сваю кваліфікацыю павышаюць выкладчыкі тэхнікумаў і вучылішчаў Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Туркменіі, Малдавіі — усяго 86 чалавек. Заняткі вядуць вопытныя выкладчыкі.

**Т. НАВАДВОРСКАЯ,**
**старшая лабарантка ФПК.**

## ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

сацыялістычнага спаборніцтва «За культурны быт» паміж інтэрнатамі універсітэта. Прызавыя месцы занялі: першае — інтэрнат № 7 (камендант З. І. Захарчэня, старшыня студсавета А. Кандратовіч); другое — № 1 (Л. К. Міхалёнак, В. Дубейка), трэцяе — інтэрнат № 6 (С. П. Волкава, С. Кухто). Інтэрнаты № 3, № 4, № 2, № 5 занялі адпаведна чацвёртае, пятае, шостае і сёмае месцы.

**П. ЛАПЦЁНАК,**
**намеснік старшыні студэнцкага прафкома.**

## РАІМ ПАДПІСАЦЦА

на часопіс «Экономические науки». У ім друкуюцца артыкулы, прысвечаныя тэарэтычным і метадалагічным праблемам эканамічнай навукі ў цеснай сувязі з практыкай камуністычнага будаўніцтва. Прафесарска-выкладчыцкі састаў у часопісе знойдзе для сябе шмат карыснага ў яго тэарэтычных і метадычных публікацыях.

Студэнтам часопіс дапаможа ў падрыхтоўцы да залікаў і экзаменаў, у напісанні дыпломных, курсавых і кантрольных работ па эканамічных дысцыплінах, а таксама ў рабоце над навуковымі дакладамі і рэфератамі.

Спецыяльныя публікацыі разлічаны на аказанне дапамогі прапагандыстам і слухачам сеткі партыйнай і эканамічнай адукацыі.

**А. КАНСТАНЦІНАЎ,**
**грамадскі карэспандэнт часопіса.**

## АЛЕЯ ГЕОГРАФАЎ

пасаджана ва універсітэцкім гарадку студэнтамі і выкладчыкамі геафака. Закладка яе прысвечана 50-годдзю з дня ўтварэння геаграфічнага факультэта — цэнтра падрыхтоўкі кадраў і геаграфічнай навукі ў рэспубліцы.

**Р. ЖМОЙДЗЯК,**
**дэкан геаграфічнага факультэта.**

ФОТАРЭПАРТАЖ — СВЯТА ВЕДАЎ

# Быў першы дзень...

**Першага верасня Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна адзначыў Дзень ведаў.**

**Вакол імправізаванай трыбуны ў строгім раўненні застылі калоны першакурснікаў. Для іх сёння не проста пачатак новага навучальнага года. Гэты дзень у жыцці ўчарашніх абітурыентаў — парог, за якім новае, пакуль яшчэ нязведанае, але такое жаданае студэнцкае жыццё.**



ГАРЭЗА-ВЕЦЕР гуляў паветранымі шарамі, імкнуўся зазірнуць, што напісана на святочных транспарантах. Яму гэта ўдалося, і таму вятрыска з радасцю запаласкаў крыламі сцягоў, якія пад урачыстыя гукі маршу плылі над галовамі студэнтаў.

Першы дзень... Будуць пасля падзеі радасныя і значныя, але ніводная з іх не ўспомніцца з такой пяшчотай у душы і замілаваннем. І не толькі будучаму фізіку Наташы Макрыцкай. «Лірыкам» Георгіі Васіліл з Кіпра і Марселіну Пачас з Перу таксама. Яны будуць вучыцца на першым курсе факультэта журналістыкі. Юнакі і дзяўчаты з 48 краін свету будуць сёлета займацца тут. Усяго універсітэт гасцінна расчыніў свае дзверы перад студэнтамі больш як 70 дзяржаў.





Для першакурснікаў 1 верасня стала не толькі днём далучэння да жыцця флагмана беларускіх ВНУ. У гэты дзень яны атрымалі эстафету ад сваіх старэйшых таварышаў, а разам з ёю права адкрываць для сябе новае і нязведанае. Сімвалічная эстафета мела выгляд палымнеючых паходняў. «Агонь ведаў» лепшыя студэнты універсітэта перадалі сваім пераемнікам — першакурснікам. Будучы біёлаг Аляксей Трыбіс прыняў факел з рук выдатніка вучобы чацвёртакурсніка фізічнага факультэта Алега Сасіловіча...

Пасля былі зачытаны словы ўрачыстай прысягі першакурсніка. Над універсітэцкім гарадком прагучала трохразовае «Клянёмся!». Момант адказны. Бо іменна з гэтай хвіліны самыя маладыя ў студэнцкай сям'і не толькі набылі пэўныя правы, але і абавязкі таксама. Добра вучыцца — першая задача. І таму ключ ад ведаў уручыў рэктар Белдзяржуніверсітэта Л. І. Кісялеўскі...

**В. ГРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

**На здымках:**

✦ Урачысты момант адкрыцця.

✦ Яшчэ хвіліна, і «агонь ведаў» студэнт другога курса фізфака Ігар Канапелька перадасць першакурснікам.

✦ Прысяга...

✦ Вось ён, ключ да ведаў!

Фота **аўтара.**



# ГАЛОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ

**У ЗАВЯРШАЮЧЫМ годзе адзінаццатай пяцігодкі ўсе сілы савецкага народа будуць скіраваны на паспяховае выкананне народнагаспадарчых планаў, вызначаных гістарычнымі рашэннямі XXVI з'езда КПСС. Партыйная арганізацыя універсітэта будзе ажыццяўляць шматпланавыя задачы па забеспячэнню вучэбна-выхаваўчага працэсу і ідэйнай загартоўкі будучых спецыялістаў. Гэта работа вядзецца па некалькіх напрамках. У першую чаргу партыйныя бюро факультэтаў і падраздзяленняў павінны ўзяць пад неаслабны кантроль правядзенне выбараў у прафсаюзных і камсамольскіх арганізацыях. Кандыдатуры камсоргаў і прафоргаў, усяго актыву неабходна абмеркаваць, накіраваць у вучэбныя групы прадстаўнікоў дэканата, партбюро, камітэта камсамола, уважліва рыхтаваць сходы, каб пазбегнуць фармалізму ў гэтай важнай справе.**

АСАБЛІВУЮ увагу патрэбна удзяліць правядзенню выбарных сходаў на першым курсе, каб новае папаўненне студэнтаў усвядоміла важнасць грамадска-палітычнай работы, з першых дзён вучобы прынялося за карпатлівую працу па засваенню ведаў. Старастамі, камсоргамі, прафоргамі на першым курсе патрэбна выбраць студэнтаў з жыццёвым вопытам, якія прыйшлі ва універсітэт з вытворчасці, Савецкай Арміі, маладых камуністаў. Працаздольны і аўтарытэтны актыў не толькі арганізоўвае работу ў групе, ён вядзе за сабой усіх студэнтаў.

Работа з першым курсам пачалася з выдатна арганізаванага свята — Дня ведаў, які запомніцца студэнтам на ўсё жыццё. Зараз на факультэтах патрэбна правесці актавыя лекцыі найбольш вядомых вучоных, прызначыць лепшых куратараў, таленавітых педагогаў і метадыстаў. Змястоўную работу з першакурснікамі вядуць на хімічным, фізічным, філалагічным факультэтах. Гэта стала традыцыяй ва універсітэце. Але гэту практыку патрэбна развіваць і абагачаць.

Партыйны камітэт ставіць задачу актывізацыі палітычнай вучобы ў сістэме партыйнай і камсамольскай адукацыі. Неабходна, каб палітычная вучоба стала цэласнай сістэмай, забяспечвалася высокім ідэйна-тэарэтычным і метадычным узроўнем, а таксама будавалася на моцнай арганізацыйнай аснове.

Партыйныя бюро павінны ўважліва сфарміраваць састаў палітінфарматараў, кіраўнікоў і дакладчыкаў тэарэтычных семінараў, адказных за арганізацыю і правядзенне адзіных палітдзён, кіраўнікоў школ маладых камуністаў. На біялагічным факультэце, факультэце прыкладной матэматыкі, у НДІ ФХП назапашаны багаты вопыт арганізацыі высокаэфектыўнай палітычнай вучобы, на факультэце журналістыкі добра працуе школа маладога камуніста, на механіка-матэматычным, юрыдычным, факультэце радыёфізікі і электронікі — метадалагічныя семінары. Пералік можна прадоўжыць. Гэта сведчыць аб тым, што палітычная вучоба ва універсітэце стала неад'емнай часткай выхаваўчага працэсу і грамадскай работы выкладчыкаў.

У сувязі з гэтым партыйны камітэт прапануе замацоўваць і развіваць карысны вопыт, абагульняць практыку работы лепшых прапагандыстаў — прафесараў С. С. Шушкевіча, Г. І. Мядзведзева, У. П. Гольцава, дацэнтаў Ф. І. Мельнікава, В. В. Мігас, А. А. Міхайлава, Г. М. Пашкоўскага, А. І. Зелянкова, А. І. Гурко.

Ва ўмовах актывізацыі ідэалагічнай работы, развіцця контрпрапаганды і актыўнага вывучэння буржуазнай філасофіі і маралі патрэбна, каб усе звенні палітвучобы працавалі аднолькава эфектыўна. Партыйным бюро нельга праходзіць міма выпадкаў фармальнага правядзення палітычных мерапрыемстваў.

Наогул, у час падрыхтоўкі да святкавання 67-й гадавіны Кастрычніка, 115-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна, 40-годдзя Вялікай Перамогі, сустрэчы XXVII з'езда КПСС патрэбна максімальна эфектыўна арганізаваць палітыка-выхаваўчую работу, з навуковага пункту гледжання аднесціся да планавання ўсіх мерапрыемстваў, каб за іх колькасцю, масавасцю не губляліся палітычны сэнс, непасрэдная работа з людзьмі, індывідуальны падыход да кожнага студэнта і супрацоўніка.

Гэтыя даты і падзеі павінны знаходзіцца ў цэнтры ўсёй ідэалагічнай работы, адлюстроўвацца ў лекцыйнай прапагандзе і матэрыялах палітычнай асветы.

Ваенна-патрыятычная работа, праслаўленне неўміручага подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны мае вялікі ўплыў на студэнтаў, фарміруе ў кожнага гатоўнасць да абароны Радзімы.

Падрыхтоўка да чарговага XXVII з'езда КПСС азначае ў першую чаргу неабходнасць далейшага вывучэння кожным студэнтам і супрацоўнікам марксісцка-ленінскай тэорыі, палітыкі Камуністычнай партыі. Гэта — дзейсны шлях павышэння ідэйнасці, выхавання высокай палітычнай свядомасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі будучага спецыяліста. Партком удзяляе асаблівую ўвагу вырашэнню гэтай праблемы.

Пад кантроль партыйных бюро патрэбна паставіць дзейнасць усіх грамадскіх арганізацый, аб'яднаць іх намаганні на карысць вучэбна-выхаваўчага працэсу, асаблівую ўвагу звярнуць на кіраўніцтва камсамолам, што вельмі глыбока абгрунтавана ў пастанове ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі».

Камсамольская арганізацыя універсітэта вядзе вялікую работу па камуністычнаму выхаванню студэнтаў, эфектыўна ўплывае на паляпшэнне паспяховасці. Патрэбна і далей развіваць гэту работу праз усведамленне кожным камуністам свайго непасрэднага абавязку — працаваць з камсамолам і ў камсамоле. Большасць нашых выкладчыкаў, напрыклад, В. Ф. Цікавы, Е. Л. Бондарава, Д. Б. Мельцар, М. Р. Прыгодзіч, В. А. Гайсёнак, Л. П. Прымачук маюць вялікі вопыт работы ў камсамоле, добра ведаюць надзённыя клопаты і запыты моладзі.

Поспех работы калектыву універсітэта залежыць таксама ад актыўнай дзейнасці прафсаюзных арганізацый. Іх работа павінна ўзрастаць у справе ўплыву на выхаваўчы працэс: работа ў інтэрнаце, арганізацыя быту і адпачынку студэнтаў, развіццё спорту, мастацкай самадзейнасці павінны праходзіць пад пільным кантролем прафсаюзнага актыву. Дарэчы, прафсаюзныя арганізацыі разам з дэканатамі павінны засяродзіць увагу на захаванні матэрыяльнай базы вучэбнага працэсу.

Летам інтэрнаты, кабінеты, лабараторыі, аўдыторыі былі падрыхтаваны да вучэбных заняткаў. Зараз неабходна не толькі захаваць памяшканні ў належным стане, але і прадоўжыць афармленне вучэбных карпусоў. Неабходна раўнамерна размеркаваць... 

**А. СЛУКА,**
**намеснік сакратара парткома.**

● ІНТЭРВ'Ю З ЮБІЛЯРАМ ●

# БАЧЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫВУ

**У верасні споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі, члена-карэспандэнта АН БССР, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР А. М. Шырокава.**

**А. М. Шырокаў — спецыяліст у галіне радыётэхнікі і радыёфізікі, тэорыі і практыкі надзейнасці і эфектыўнасці складаных радыёэлектронных сістэм. Кола навуковых інтарэсаў Аляксандра Міхайлавіча—актуальныя праблемы радыёфізікі і электронікі, тэхнічнай кібернетыкі, перспектывы развіцця і выкарыстання ў ВНУ тэхнічных сродкаў навучання, агульныя асновы арганізацыі вучэбнага працэсу.**

**Аляксандр Міхайлавіч — педагог, які выпрацоўвае ў сваіх вучняў навыкі творчага падыходу ў вырашэнні навуковых праблем. Шырокі навуковы кругагляд, выдатныя чалавечыя якасці дапамаглі яму заслужыць любоў і павагу моладзі, студэнтаў універсітэта. З ім наша інтэрв'ю.**

— Адна з хвалюючых мяне праблем у падрыхтоўцы студэнтаў заключаецца ў тым, што яны часта не могуць, не умеюць ці не хочуць правільна арганізаваць сваю самастойную работу, а мы, педагогі, не заўсёды ўмеем навучыць вучыцца, не умеем выпрацаваць навыкі самастойнай работы.

Я б звярнуў увагу на тры складаемыя дзейнасці студэнта, ад рэалізацыі якіх залежыць эфектыўнасць яго вучобы ў ВНУ.

Першае і галоўнае — невычэрпнае жаданне працаваць, усведамленне таго, што праца вучонага не толькі ганаровая, але вельмі цяжкая і адказная.

Другое — рабочая атмасфера ў калектыве, у якім студэнт вучыцца-жыве: у вучэбнай групе, лабараторыі, інтэрнаце. Наша задача — выхаваць лідэраў, якія маглі б быць душой студэнцкіх калектываў.

І апошняе — разуменне таго, што час вучобы ў ВНУ — найбольш спрыяльны для таго, каб стаць чалавекам і вучоным. Каб паспець сказаць сваё слова ў навуцы, пачынаць патрэбна ўжо са студэнцкіх гадоў: праводзіць самастойныя даследаванні і друкаваць іх вынікі, закладваць аснову сваіх будучых поспехаў у навуцы і на вытворчасці.

У рэалізацыі гэтых умоў поспеху перад намі стаіць шмат задач. Да іх адносяцца павышэнне кваліфікацыі выкладчыцкага саставу, забеспячэнне лабараторый сучасным абсталяваннем. Словам, мы павінны зрабіць сучасным увесь вучэбны працэс. З гэтай мэтай, у прыватнасці, на факультэце актыўна ўкараняюцца тэхнічныя сродкі навучання. Аднак яны не могуць замяніць выкладчыка — творцы, які павінен захапіць, запаліць агнём ведаў студэнтаў. Больш таго, тэхнічныя сродкі навучання не спрашчаюць работу выкладчыка, а прад'яўляюць да яго дадатковыя патрабаванні. Кожны выкладчык павінен працаваць, чытаць лекцыі на ўзроўні сучасных дасягненняў навукі, больш таго — на ўзроўні дасягненняў сваіх, дасягненняў калектыву кафедры, факультэта. Тады і толькі тады можна зацікавіць у пазнанні новага і студэнта, і сябе.

У фарміраванні ж чалавечых якасцей студэнта вядучая роля павінна належаць грамадскім арганізацыям, і ў першую чаргу камсамолу. Грамадская работа не дазваляе прарастаць індывідуалізму — згубнай якасці і для вучонага, і проста для чалавека.

**— Аляксандр Міхайлавіч, ці раздзяляеце Вы той пункт гледжання, што грамадская работа перашкаджае вучобе, забірае ў студэнтаў вельмі многа часу!**

— Зразумела, галоўнае для студэнта — вучоба. А калі на першае месца становіцца грамадская работа — гэта ўжо шкодна. Прычына гэтай з'явы — перагрузка адных, гатовых узяцца за любую справу, і пасіўнасць у грамадскім жыцці другіх. Праблема, якая патрабуе вырашэння, — усімі сіламі ўмацоўваць аўтарытэт грамадскіх арганізацый, уцягваць у грамадскае жыццё ўсіх без выключэння студэнтаў. Тады не будзе ў нас «перагружаных» актывістаў, а сама грамадская работа будзе прыносіць толькі карысць, і вялікую.

**— Якія праблемы, спецыфічныя для падрыхтоўкі радыёфізікаў, стаяць зараз перад калектывам факультэта, які Вы ўзначальваеце!**

— Асноўная праблема заключаецца ў навучанні студэнтаў рабоце на ЭВМ — самым магутным прыстасаванні даследчыка. Вылічальныя машыны дазваляюць палепшыць вынікі апрацоўкі даных. Даследчык вызваляецца ад львінай долі механічнай работы, застаецца толькі роздум над вынікамі эксперыменту. ЭВМ стала сёння памочнікам і філолагаў, і гісторыкаў, і археолагаў, але ў першую чаргу яна патрэбна нам, радыёфізікам. Таму зараз мы імкнёмся вырашыць задачу практычнага навучання студэнтаў рабоце з сучаснай вылічальнай тэхнікай, імкнёмся пераадолець узнікаючыя пры гэтым цяжкасці арганізацыйнага, матэрыяльнага і псіхалагічнага плана. Навуковая работа кожнага студэнта павінна быць звязана з асваеннем ЭВМ.

**— З Вашых слоў вынікае, што адна з абавязковых састаўных частак вучэбнага працэсу ў ВНУ — удзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце. Як ажыццяўляецца гэта на практыцы на факультэце радыёфізікі і электронікі!**

— Галоўная форма навуковай работы студэнтаў на факультэце — удзел у дзейнасці шасці студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый (СНДЛ) пры ўсіх кафедрах. Гэта форма работы сябе апраўдвае. Студэнцкім лабараторыям пад сілу вырашэнне самых складаных задач, выкананне работ па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы. Гэта дае вопыт калектыўнай работы ў навуцы, паяўляецца магчымасць кожнаму даць дакладны напрамак дзейнасці: пачынаючаму даследчыку неабходна цвёрда ведаць, што рабіць сёння і заўтра. Сакрэт эфектыўнай дзейнасці лабараторый на факультэце заключаецца яшчэ і ў тым, што іх кіраўнікі імкнуцца стварыць атмасферу, у якой у студэнтаў не паяўляецца расчараванне ў магчымых памылках.

**— Якім бачыцца Вам шлях у навуку сённяшняга студэнта! Раскажыце, калі ласка, як прыйшлі ў навуку Вы.**

— Пачынаць навуковую дзейнасць варта не пазней другога курса. На гэтым этапе неабходна ўсебакова авалодаць матэматычным апаратам і вылічальнай тэхнікай. На чацвёртым курсе — спроба пяра: артыкулы, заяўкі на вынаходніцтвы. Пасля заканчэння ВНУ — па меншай меры два гады практычнай работы, пасля — аспірантура, абарона кандыдацкай дысертацыі.

Сам я пачаў займацца навуковай работай, калі вучыўся на 4-м курсе. Вынік першага навуковага даследавання хутка атрымаў прызнанне спецыялістаў. Я застаўся працаваць на кафедры выкладчыкам, у 1960 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю, праз дзесяць гадоў — доктарскую. Лічу, што важным стымулам маёй працы была і застаецца цікаўнасць вучняў...

**— Аляксандр Міхайлавіч, сярод Вашых вучняў пяць дактароў навук і 29 кандыдатаў. У чым, на Ваш погляд, заключаецца аснова творчага супрацоўніцтва настаўніка і вучня! Ці ёсць аптымальныя тэрміны такога супрацоўніцтва!**

— Асноўным у адносінах настаўніка і вучня павінна быць узаемная прыхільнасць. Павага настаўніка да вучня і наадварот. Важнае патрабаванне да навуковага кіраўніка заключаецца ў тым, што ён павінен жадаць кіраваць, павінен сам працаваць так, каб да яго цягнуліся вучні, каб вакол яго ўзнікаў навуковы калектыў аднадумцаў.

На мой погляд, існуюць два аптымальныя інтэрвалы ва ўзросце настаўніка і вучня. Першы — 10—15 гадоў, калі вучань працягвае распрацоўкі, пачатыя яго кіраўніком. Другі — 25—30 гадоў, калі кіраўнік — вядомы вучоны, пад кіраўніцтвам якога выконваюцца даследчыя работы ў новых напрамках.

**— А якія патрабаванні прад'яўляюцца сёння жыццём да самога студэнта! Якімі прафесійнымі і маральнымі якасцямі павінен валодаць сучасны студэнт!**

— Па-першае, быць шчырым чалавекам. Мець высокі ідэйна-палітычны і маральны ўзровень. Абавязковая прафесійная якасць — быць працаздольным. І, вядома, сапраўдны студэнт павінен валодаць пачуццём гумару.

**Запісаў Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.**




# «ПЯЦЁРКА» СТАРШЫНІ

**Сельскагаспадарчы атрад студэнтаў першага курса факультэта радыёфізікі і электронікі працуе ў Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласці. Пра тое, як жывуць і працуюць першакурснікі ў гэтыя верасноўскія дні, расказвае карэспандэнт газеты Ч. Віктараў, які наведаў калгас «Шлях да камунізму».**

Цэнтральная сядзіба калгаса. З адчыненых дзвярэй збожжатока даляцеў рэзкі, патрабавальны сігнал. Малады шафёр, што чакаў сваёй чаргі ля ўваходу ў збожжасховішча, хутка азірнуўся і заспяшаўся да свайго «газіка», каб стаць пад пагрузку.

У гэты самы час яны і паявіліся з глыбіні доўгага і прысадзістага будынка зернясховішча: Дзмітрый Кабо, Ігар Емцаў, Барыс Базулеў, Яўген Адамовіч, Сяргей Позняк і Ігар Арзамазаў. Машыну, што пакінула сховішча, яны загрузілі некалькі хвілін назад. Яна ўжо шостая з раніцы. У чарзе стаялі яшчэ тры. Іх патрэбна паспець загрузіць да абеду.

Пакуль шафёр чарговай машыны стараецца трапіць дакладна пад ленту транспарцёра перасовачнага збожжапагрузчыка, у рабят ёсць час, каб крышку адпачыць, і яны падсаджваюцца да шафёраў з «Сельгастэхнікі». Дзіма Кабо і Жэня Адамовіч дапамаглі закрыць брызентам толькі што загружаную машыну.

— Як працуецца? — пытаюся ў рабят.

— Нічога... Работа быццам не скардзіцца, — адказвае за ўсіх Ігар Емцаў.

Пераглянуўшыся, студэнты глядзяць на Міхаіла Іванавіча Кірпічэнку, загадчыка збожжатока: што скажа іх непасрэдны начальнік?

— Не мая гэта справа пахвальбу раздаваць, але да студэнтаў ніякіх заўваг няма. Нават больш скажу: дружныя рабяты, талковыя.

Кірпічэнка «пахвальбу раздаваць» больш не стаў, але мне з самага пачатку была вядома гісторыя, да якой ён меў самае непасрэднае дачыненне. Адбылося гэта ў адзін з першых рабочых дзён. Загадчык збожжатока «наляцеў» на склад, каб яшчэ раз праінструктаваць студэнтаў. У гэты дзень машыны пад пагрузку не прыходзілі, але ў рабят было заданне: перапалапаціць збожжа з дальняга вугла, куды не мог дабрацца збожжапагрузчык. Як там студэнтам працавалася з раніцы — адным ім вядома. Толькі да абеду, калі паявіўся «загток», не было зроблена і чацвёртай часткі работы, а рабяты зноў «курылі».

— Што, гультайнічаем? — «загток» задаваў пытанне, як ён любіў казаць, «у лоб і па сутнасці».

— Ні ў якім разе, — амаль хорам адказалі студэнты.

— Як «ні ў якім разе», а гэта... — Кірпічэнка паказаў на амаль непачатую работу.

— А што тут нам, асілкам, рабіць? — спытаў за ўсіх Ігар Емцаў. — Тут жа работы на паўгадзіны, а нас сюды шасцярых на цэлы дзень паставілі.

Тое, што работы было на паўгадзіны, вядома, Ігар перабольшыў, але ад сказанага адступацца не было куды. Перабіваючы на спрэчку рукі, «загток» толькі і сказаў:

— Глядзіце, хлопцы, не пралічыцеся.

Работа закіпела. Перакідаць за паўгадзіны каля трыццаці тонн збожжа стала справай прынцыпу.

Кірпічэнка вярнуўся на склад роўна праз паўгадзіны. Глянуў і вачам сваім не паверыў: перапалапачанае збожжа загарадзіла ўвесь праезд, а ля сцяны сядзела стомленая шасцёрка. І на твары кожнага можна было прачытаць: «Ну, чый верх!?».

А потым была і работа ў начную звену, і збожжапагрузчык выходзіў са строю — усё адолелі студэнты.

Думка старшыні калгаса В. Я. Капусціна ў адносінах да сельскагаспадарчага атрада цвёрдая: «Без студэнтаў нам было б цяжка. Асабліва на полі, на ўборцы бульбы. Восень часта засмучае нас дажджамі, і тэхніка ў такіх умовах выбірае клубні не зусім чыста. Шмат даводзіцца збіраць пасля камбайнаў. І тут асноўная работа кладзецца на студэнцкія брыгады Алега Варанцова і Міхаіла Невадава. Студэнты ж там, як і на таку, спраўляюцца са сваімі абавязкамі выдатна».

Першую студэнцкую адзнаку, будзем лічыць, радыёфізікі атрымалі.

# ПАРА ДАРОСЛЫХ УЧЫНКАЎ

**БУЛЬБАЎБОРАЧНЫ камбайн дайшоў да канца поля, развярнуўся і, стаўшы на новы загон, рушыў назад. Якраз у гэты час Фёдар Новікаў, малады шафёр саўгаса «Малышкавічы», з'ехаў з дарогі і напрамкі цераз поле накіраваў сваю машыну к камбайну — пад пагрузку. Следам за ім з высокага насыпу заасфальтаванай шашы скацілася на поле і перасовачная кухня.**

Звеннявы Аляксандр Анішчанка спыніў «Беларусь» і, выскачыўшы з кабіны, крыкнуў памочнікам:

— Усё, рабяты-дзяўчаты, хопіць. Абед...

Вольга Топарава, Лілія Шабоцька і Сяргей Яўміненка, студэнты хімічнага факультэта, сталі «разгерметызоўвацца» — скідаць зашпіленыя наглуха капюшоны штармовак, развязваць нацягнутыя на самыя вочы шалікі...

— Так, работу нашу «не пыльнай» не назавеш,— Сяргей скінуў свой «касцюм» першым. — Мы нават рады, калі гадзіну і пройдзе дождж. Тады пылу становіцца намнога менш.

— У нашым сельскагаспадарчым атрадзе толькі мы ўтрох працуем на бульбаўборачным камбайне,— уключаюцца ў размову дзяўчаты.— Зразумела, бывае цяжка, але калі ў полі лёгка? За дзень, калі спрыяе надвор'е, наша «механізаваная каманда» ўбірае да 30 тон клубняў.



А тым часам пачынаецца абед. Студэнты разам з механізатарамі залазяць у кузаў аўтакухні, а парторг М. С. Судзілоўскі, які прыехаў паглядзець на работу студэнтаў, ідзе ўздоўж поля. Час ад часу ён спыняецца, правярае, ці не засталася ў зямлі бульба.

— Рабяты і дзяўчаты тут у асноўным гарадскія. Не ўсякую нашу работу ведаюць. Але затое старанныя. Энтузіясты...

«Энтузіясты». Як я зразумеў з пазнейшай размовы з Судзілоўскім, гэта слова ў яго гучала сінонімам малайцоў. Энтузіястамі былі ў яго і Ігар Фядотаў, і Мікалай Чаўлытко, і Юрый Мацвеенка, і Ігар Васілеўскі — першакурснікі з вытворчага патока, што вось ужо тыдзень працуюць на закладцы бульбяных буртоў. І дзяўчаты Віка Наполава, Ірына Красоўская, Вольга Трусевіч, Ірына Ждановіч. З імі я сустрэўся на КСП — кантрольна-сарціравальным пункце. Здалёк КСП нагадвае мурашнік: з усіх бакоў спяшаюцца да яго машыны розных марак. Адны падвозяць убраную бульбу. Другія гэтую ж бульбу, толькі ўжо рассарціраваную, адвозяць ці ў капцы, ці ў сховішчы ў раённы цэнтр. Але перад тым, як трапіць у бункер, усе гэтыя тысячы і сотні тысяч бульбін праходзяць праз рукі чатырох дзяўчат: дзвюх Ірын, Вікі і Вольгі. Іх задача—рассарціраваць усю бульбу на вялікую і малую, адабраць гнілую, нестандартную. Бульбяны канвеер рухаецца практычна бесперапынна, а работа патрабуе ад дзяўчат засяроджанасці і ўвагі. Таму пагутарыць са студэнткамі можна толькі ў час кароткага перапынку, калі мяняюцца машыны на разгрузцы.

**Ірына Ждановіч:**

— Для мяне гэта першая студэнцкая «бульба». Што больш за ўсё запомнілася? Дарога. Мы ехалі амаль цэлы дзень, стаміліся спяваць, перазнаёміліся. Я ніколі не ездзіла так далёка ад дому.

**Вольга Трусевіч:**

— Памятаю, з якім жаданнем папрацаваць выйшлі на работу ў першы дзень. Усё было новае, незнаёмае... Усё — упершыню.

**Віка Наполава:**

— Сельгасатрад, зразумела, падружыў нас, даў магчымасць бліжэй пазнаць адзін аднаго, выбраць сабе верных сяброў.

**Ірына Красоўская:**

— Бульба — гэта час дарослых учынкаў...

**В. ДЗМІТРЫЕЎ,**
**наш кар.**

## ● ІНТЭРВ'Ю: АДНО ПЫТАННЕ ●

# СТАВІЦЬ ПРАБЛЕМЫ «ВЯСКОВЫ СЕМЕСТР»

**Больш тысячы студэнтаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ўбіраюць зараз «другі хлеб» разам з бульбаводамі Клімавіцкага раёна. Як жа іх прынялі ў гаспадарках! З гэтым пытаннем мы звярнуліся да камісара занальнага штаба студэнцкіх сельгасатрадаў, старшага выкладчыка БДУ Э. Я. Радоўскага.**

— 360 ПЕРШАКУРСНІКАЎ хімічнага і радыёфізічнага факультэтаў раздзелены на сем студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў, якія працуюць на бульбяных плантацыях эксперыментальнай базы «Раднянская», саўгасаў «Малышкавічы», «Макеевічы», «Мілаславіцкі», калгасаў «Шлях да камунізму», імя Ільіча, «Герой працы».

Сярод калектываў асабліва вызначаецца атрад студэнтаў факультэта радыёфізікі і электронікі, які прымае эксперыментальная база «Раднянская». Байцы выступілі са зваротам да ўсіх сельгасатрадаў, што працуюць у раёне, і заклікалі разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва пад дэвізам «40-годдзю Вялікай Перамогі — нашу ўдарную працу!» Ініцыятары абавязаліся штодня выконваць норму на 110 працэнтаў, выступіць перад працаўнікамі вёскі не менш як з трыма канцэртамі, прачытаць пяць лекцый, аказаць дапамогу сем'ям ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны...

Радыёфізікі слова сваё трымаюць. Толькі за апошнія два дні работы юнакі і дзяўчаты падабралі за капалкамі 67 тон бульбы. Працуюць яны і на камбайнах.

Разам з тым, маюць месца факты, калі студэнты заняты на іншых відах работ, не абумоўленых дагаворам. Узяць тую ж эксперыментальную базу «Раднянская». Са ста чалавек падборам клубняў заняты толькі 32. Прычым і яны нясвоечасова забяспечваюцца работай. Такая раскачка, як вядома, не на карысць агульнай справе, якой заняты зараз і гаспадарка, і студэнты. Не лепшае становішча ў саўгасе «Малышкавічы». Сюды заехала каля сарака студэнтаў універсітэта, а на ўборцы бульбы вось ужо тыдзень працуе толькі шэсць.

Гэты пералік прыкладаў можа папоўніць і саўгас «Мілаславіцкі». Студэнты разгрузяць машыну і сядзяць без справы ў чаканні наступнай гадзіны, а то і болей. Прычым адміністрацыя гаспадаркі ведае аб такой арганізацыі працы, аднак становішча не выпраўляецца, хаця дырэктар саўгаса А. П. Алейнікаў неаднаразова абяцаў навесці парадак.

З якой ахвотай, жаданнем папрацаваць едуць студэнты на «бульбу», расказваць не трэба. І вельмі крыўдна, што ў гаспадарках раёна ім міжволі прыйшлося астудзіць свой працоўны энтузіязм. Прычынай таму абыякавыя адносіны з боку кіраўніцтва калгасаў і саўгасаў, што прымаюць сельскагаспадарчыя студэнцкія атрады.

**Запісаў**
**І. ЛАПО,**
**супрацоўнік клімавіцкай райгазеты «Новае жыццё».**

● РЭХА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА ●




**УСЯ ЯГО будатрадаўская біяграфія змяшчаецца ў адным слове «Рытм». Так называўся будаўнічы атрад механіка-матэматычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, байцом якога дзевяць гадоў назад упершыню ў сваім жыцці стаў васьмікласнік Ігар Вярэнчыкаў. Не, такі паварот у яго лёсе адбыўся не праз дзіцячы пакой міліцыі. Проста Ігар намнога раней за сваіх аднагодкаў звысоку глянуў на бесклапотнае жыццё ў піянерскім лагеры. А з «Рытмам» не развітаўся і на наступны год. А пасля выпускнога балю для маці Ігара і яго настаўнікаў грымнуў гром сярод яснага неба: здольны хлопец замест паступлення ў інстытут выбраў бетон, цэглу і сяброў у будатрадаўскай форме.**

ГЭТА, БАДАЙ, усё, што ўдалося даведацца пра Ігара ад яго самога па дарозе ў вёску Кухчыцы, бо астатняе ён гаварыў пра атрад. Што за чатыры гады існавання састаў «Рытма» амаль не змяніўся, што трэці год працуюць яны ў калгасе «Савецкая Беларусь» Клецкага раёна, што ў Заляшанах байцы пабудавалі помнік загінуўшым воінам, што... З расказа Ігара я запомніла не ўсё, бо што можна запісаць у кузаве грузавіка, які імчыць па гравейцы. Ды і сумка з блакнотам засталася недзе ў кабіне на стосе пакетаў і скруткаў. Камандзір вяртаўся з занальнага штаба і, вядома, па парадку выкрэсліваў пункты ў падрыхтаваным поварамі спісе.

Назваць атрад БДУ «Рытмам» Ігар Вярэнчыкаў прапанаваў, яшчэ не будучы яго камандзірам. (Зразумела, па назве ранейшага атрада, дзе ён тры гады крочыў побач са сваімі таварышамі). Але камандзірскія абавязкі давялося выконваць усё ж Ігару: больш ніхто са слухачоў падрыхтоўчага аддзялення юрыдычнага факультэта БДУ ніводнага разу не быў у СБА. Да таго ж, Ігар Вярэнчыкаў — камсорг групы, паказаў сябе за год нядрэнным арганізатарам. Вось і павёз ён свой «пэашны» атрад у Міёры Віцебскай вобласці.

Часам глядзіш збоку на нечую работу, і простай яна здаецца, асабліва калі чалавек лёгка з ёю спраўляецца. А вось паспрабуеш сам, і ўбачыш яе ў іншым святле. Неяк пачула, можа і не зусім удалае, параўнанне, што дом пачынаецца з дзвярэй, а атрад—з камандзіра. Камандзір рыхтуе атраду фронт работ, ведае здольнасці кожнага байца і ўсіх іх як калектыў. Калі сёння на другі паверх дома механізатара, што будуецца ў машынна-трактарным парку вёскі Кухчыцы, байцы вёдрамі носяць бетонны раствор, то, вядома ж, камандзір разам з майстрам паклапоцяцца пра лябёдку. Едзеш «выбіваць» бетон ці шыфер, не забудзь завезці ў аптэку сабраныя лекавыя травы, а па дарозе назад прыхапіць макарону. Сапраўды, не траціць жа ўрачу і адказнаму за харчаванне на ўсё гэта цэлы дзень.

Ігар сказаў, што самае цяжкае для камандзіра — гэта забеспячэнне атрада будматэрыяламі. Каб прасіць ці прымушаць каго ісці на работу? Такога ў «Рытме» не бывае. З якасцю таксама няма праблем: у кожнага байца не менш чым трэці разрад муляра ці бетоншчыка, ды і вопыт ёсць.

Камісар СБА «Рытм» Аляксей Каўзуновіч вызначыў такія асноўныя якасці свайго камандзіра: дзелавітасць і ўважлівасць да людзей.

Дадзеным камандзіру правам загадваць Ігар ніколі не карыстаўся. Спрэчныя пытанні тут вырашаюцца разам, памылковыя пазіцыі ліквідуюцца метадам пераканання.

Навічок атрада Аляксандр Дзямяшкевіч шчыра здзівіўся ўменню Ігара быць на роўных з усімі і ў той жа час пакідаць за сабой апошняе, рашаючае слова. Вярэнчыкаў смяецца разам з байцамі з напісанага ў яго адрас чарговага сяброўскага шаржу Леаніда Пуцірскага.

— Адны нараджаюцца з талентам паэта, другія—мастака, у Вярэнчыкава талент арганізатара, — сказаў баец Уладзімір Яфімаў.

Толькі сам Ігар думае інакш. Тое, што «Рытм» выступіў з трынаццаццю канцэртамі, больш, чым іншы атрад Клецкай зоны, назапасіў сена, перавыканаў план збору лекавых траў, пабудаваў помнік загінуўшым вызваліцелям вёскі—гэта менш за ўсё яго ці камісара заслугі. Як кажуць, ініцыятыва знізу. Толя Лісок, Сяргей Чарнячкоў, Ліда Федарук ды большая палова байцоў — сябры Ігара, праверaныя ў вучобе і рабоце. Так што іншымі адносіны з імі ён не ўяўляе.

Ці даводзілася вам чуць пра дрэннага камандзіра ў добрым атрадзе? Такога не бывае? Не бывае, таму што з роляй лідэра ў сапраўдным калектыве выпадковы чалавек не справіцца. Калі Ігар Вярэнчыкаў у шэсць гадзін раніцы садзіцца ў штабе, каб дэталёва распісаць план работы на дзень, з-за недахопу бетону абівае парогі арганізацый, а вечарам аб'язджае аб'екты, каб заўтра зноў спланаваць работу — ён проста выконвае свае абавязкі.

У гэтым годзе Вярэнчыкаў з вялікімі цяжкасцямі, як ён сказаў, «вырваўся» ў «Рытм». Пасада ў яго зараз турботная: начальнік штаба працоўных спраў БДУ імя У. І. Леніна, камандзір зводнага атрада, у які ўваходзяць 106 лінейных. І ўсё ж хоць два месяцы пабыў з «Рытмам».

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# МЕСЯЦ ПА БЕРЛІНСКАМУ ЧАСУ



**Інтэрнацыянальны атрад «Мінск-84» працаваў у час трэцяга семестра ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Нашы студэнты выйшлі пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве паміж атрадамі інтэрлагера. Пра іх — сённяшні расказ.**

**● А ПАМЯТАЕШ... БЫЛО**

ПРАЦОЎНАЯ АКЦЫЯ Саюза Свабоднай Нямецкай Моладзі «Здаровы лес» — так перакладаецца надпіс на белым полі зялёнага вымпела. Кожны з нас, дваццаці студэнтаў інтэратрада «Мінск-84» БДУ імя У. І. Леніна, атрымаў такі вымпел у той памятны вечар у інтэрнацыянальным лагеры, што размясціўся непадалёку ад горада Йена, на самым поўдні ГДР. На яго зваротным баку значыцца: «Пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва».

Так, у той жнівеньскі вечар у лагеры былі падведзены вынікі работы студэнцкіх атрадаў са Славакіі, ГДР, Грузіі, Ленінграда, Казахстана, Арменіі і Беларусі. Беларускія студэнты, атрад якіх быў вызначаны як лепшы, атрымалі памятныя сцягі, падзякі і каштоўныя падарункі ад кіраўніцтва лагера і лесанарыхтоўчага прадпрыемства «Вайда».

Але ўсё гэта было ў апошні дзень. Расказваючы ж аб тым, як працаваў атрад «Мінск-84», патрэбна адзначыць саму гісторыю акцыі «Здаровы лес» тут, у Цюрынгіі, дзе ўжо не першы год і працуюць студэнты з універсітэта.

**● РЭТРАСПЕКТЫВА**

«ШЧЫЛЬНЫМ СЛОЕМ ляжаць на зямлі зламаныя вяршаліны зялёных елак, і сотні дрэў навокал нагадваюць пашчапаныя і пагнутыя зубачысткі...» — так апісвалі газеты ў 1982 годзе вынікі незвычайна моцнага снегападу, які абрушыўся на Цюрынгскі лес.

Звыш пяці мільёнаў кубаметраў хвойнай драўніны было вывезена з лесу ў першы ж год. Але лесаводы Цюрынгіі добра разумелі, што заспакойвацца рана: сухастою і неразабраных завалаў засталося яшчэ шмат. У акрузе Гера, у састаў якой уваходзіць Цюрынгскі лес, дзяржаўныя органы даручылі насельніцтву адказную задачу: аказаць падтрымку лесагаспадарчым прадпрыемствам пры выратаванні драўніны. На дапамогу лясніцтвам прыйшлі школьнікі, Саюз Свабоднай Нямецкай Моладзі. Вось у той час і нарадзілася акцыя «Здаровы лес». Да яе далучыліся і студэнты з братніх сацыялістычных краін—Чэхаславакіі, Польшчы, Венгрыі, Савецкага Саюза, Балгарыі.

**● «НА САДЖАНЦАХ...»**

АСАБЛІВА запомніўся адзін з самых напружаных дзён працы. У той ранак нам упершыню выдалі сякеры, спецыяльна насаджаныя на доўгія тапарышчы. Да гэтага мы працавалі «на саджанцах» —абжыналі сярпамі траву вакол маленькіх елачак, каб яна не глушыла маладыя парасткі. На экране сацыялістычнага спаборніцтва насупраць назвы нашага атрада ніводнага разу не паявілася лічба, ніжэйшая за 100 працэнтаў. А некалькі дзён атрад выконваў нават больш за дзве нормы. Павіншаваць атрад з працоўным поспехам у поле прыехаў сам ляснічы. Студэнты-філолагі аддзялення рускай мовы Йенскага універсітэта Томас і Петэр, якія працавалі разам з намі, пераклалі словы падзякі... і здзіўлення.

— Справа ў тым, — тлумачыў далей ляснічы, — што на тое ж поле з саджанцамі, якое вы прывялі да ладу менш чым за два дні, у мінулым годзе наш нямецкі атрад студэнтаў быў вымушаны патраціць пяць дзён. А хлопцы і дзяўчаты там таксама ўмелі працаваць...

Тады мы толькі пераглянуліся. А ў час абедзеннага перапынку, калі ўсімі «паважаны кухар Ганна» — Аня Лабанок —частавала атрад толькі што прыгатаванай стравай са свежай капусты ды традыцыйнымі нямецкімі бутэрбродамі, нашы перадавікі Генадзь Ждановіч, Уладзімір Аляксейчык і Васіль Супрун запэўнілі, што і дзве нормы — таксама не мяжа магчымасцей атрада. І ў тым, што гэта сапраўды так, хутка пераканаліся ўсе. Праз два дні быў устаноўлены новы рэкорд выпрацоўкі — 256,2 працэнта!

**● ...І НА ПРАСВЯТЛЕННІ**

АЛЕ ТУТ былі свае нюансы. На тую пару на саджанцах працаваў яшчэ толькі адзін славацкі атрад. З ім мы ў асноўным і спаборнічалі. Астатнія студэнты выконвалі работы па прасвятленню лесу: секлі, распілоўвалі і выносілі на дарогу елкі. Гэта работа лічылася больш цяжкай, патрабавала пэўнага часу, каб прызвычаіцца... Таму, безумоўна, мы крыху хваляваліся раніцай выдатнага жнівеньскага дня, стоячы перад непралазным гушчаром, што пачынаўся ад самай дарогі.

— Ну што, наперад! — выслухаўшы парады ляснічых, падаў каманду камандзір атрада.

Аляксандр Стэльмах, Цімафей Шваркоў, Андрэй Цялегін, Ігар Макарэвіч, Андрэй Нікіфараў і іншыя, расцягнуўшыся ланцугом уздоўж ускрайку лесу, узяліся за работу. Вось тут як нельга лепей і спатрэбіўся хлопцам той вопыт работы ў лесе ў падрыхтоўчы перыяд, калі атрад працаваў на прасвятленні лесу непадалёку ад Мінскага мора. Ужо праз дзве гадзіны работы, калі падводзіліся першыя вынікі, стала зразумела — «Мінску-84» такая праца пад сілу. Так і адбылося. У першы ж дзень атрад значна перавыканаў нормы нарыхтоўкі.

**● ДЗЕНЬ РЭСПУБЛІКІ.**

І ЯШЧЭ адзін дзень надоўга застанецца ў памяці байцоў атрада — Дзень рэспублікі. Так называліся дні, у якія са сваёй культурнай праграмай выступаў той ці іншы атрад. Рыхтавацца да гэтага выступлення байцы атрада пачалі яшчэ задоўга да паездкі ў ГДР. Але, як кажуць, у самы апошні момант у кіраўніка агітбрыгады Цімафея Шваркова ўзнікла ідэя — стварыць невялікія сатырычныя тэатральныя пародыі на будні лагера. Ідэя была слушнай, тым больш, што для выступлення атраду неабходны быў гумар. Да дня выступлення заставаліся суткі, таму думалі ўсім атрадам палову ночы, потым дзень і вечар, пакуль не прыйшоў «майстар і маг сцэны». Вадзім Цюцюноў. Ён за паўгадзіны даў столькі прапаноў, што адных іх хапіла б на цэлы вечар выступлення. Апошнія рэпетыцыі адбыліся літаральна за пяць мінут да пачатку канцэрта.

...Поспех пераўзышоў усе чаканні. Шчодрая на апладысменты, але даволі строгая аўдыторыя авацыямі праводзіла і выканаўцаў беларускай народнай песні «Купалінка» Марыну Ратнікаву, Уладзіміра Пракоф'ева, Алену Гржылеўскую, і танцы Алены Парфёнавай, і аўтараў сатырычных мініяцюр, пародый... Словам, свята рэспублікі адбылося.

...А цягнік ужо адышоў ад перона. Ён пакрысе набірае хуткасць, і праз адчыненае акно яшчэ ёсць магчымасць памахаць рукой на развітанне Франку і Хэльдрун — нашым гідам-арганізатарам, студэнтам Йенскага універсітэта, з якімі мы паспелі пасябраваць у час паездкі па краіне. Доўга яшчэ будуць дзяліцца ўражаннямі байцы атрада ад наведвання Трэптаў-парка, Бухенвальда, Дрэздэнскай галерэі, музея скарбаў «Зялёныя шаты» ў Дрэздэне, замка Сан-Сусі ў Патсдаме, дамоў-музеяў Шылера і Гётэ ў Веймары...

Цягнік набірае хуткасць. «Бывай, Берлін!» — рука апошні раз у развітальным адчаі рвецца праз фортку вагона. А думкі ўжо лунаюць далёка-далёка, па родных вуліцах, ля знаёмых будынкаў... У думках ты ўжо вітаеш тую адзіную зямлю, што завецца Радзімай.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**баец атрада «Мінск-84».**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

27 верасня 1984 г.

Зак. 1542. АТ 10425

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ